**С. Я. Новікаў**

# МАШТАБЫ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НАЦЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА ГРАМАДЗЯНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1941–1944 гг. (па дакументальных матэрыялах НАРБ)

Вызначэнню маштабаў злачынстваў у дачыненні да грамадзянскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларускай ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны служаць зборнікі архіўных дакументаў і матэрыялаў НАРБ, выдадзеныя ў апошнія два гады ў рамках серыі «Без тэрміну даўніны». Аўтар аналізуе змест толькі аднаго з выданняў (2021 г.), у якім сістэматызавана прадстаўлены 163 архіўныя дакументы і матэрыялы па Магілёўскай вобласці 1941–1944 гг.

Структуру зборніка складаюць два раздзелы і дадаткі у якіх скампанаваны дакументальныя крыніцы ў рамкам раскрыцця, з аднаго боку, праяў нацысцкай палітыкі генацыду і выпаленай зямлі на тэрыторыі 21 раёна Магілёўскай вобласці і горада Магілёва, а з другога – выяўленне маштабаў злачынстваў германскіх акупантаў і іх памагатых у дачыненні да грамадзянскага насельніцтва адной з 10 абласцей занятай БССР. Апроч таго, зборнік утрымлівае дадаткі у выглядзе спісаў месцаў прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва, масавага знішчэння яўрэяў, правядзення найбольш буйных карных аперацый, а таксама сельскіх населеных пунктаў, знішчаных нямецкімі акупантамі цалкам ці часткова на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў 1941–1944 гг. Адразу заўважым, што кожны з прыведзеных раздзелаў і дадаткаў патрабуе самага ўважлівага аналізу і дэталёвага вывучэння, а таксама выкарыстання ў навуковай, інфармацыйнай і выхаваўчай працы з студэнцкай моладдзю ў рамках вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (ў кантэксце Другой сусветнай вайны)» ці новай вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», а таксама з мэтай захавання праўдзівай гістарычнай памяці.

У нашым выпадку прааналізуем толькі некалькі дакументаў і матэрыялаў, якія ўтрымліваюць першыя два раздзелы. Знаёмства з 66 дакументамі першага раздзела дазваляе адзначыць той факт, што абсалютная большасць матэрыялаў датычыцца злачынстваў нямецкіх карнікаў, пра якія сведчаць даклады камандавання партызанскіх атрадаў, актаў аб знішчэнні населеных пунктаў у асобных раёнах вобласці, злачынстваў карнікаў у дачыненні да грамадзянскага насельніцтва, звестак, загадаў, радыёграм і інш. Самымі адметнымі можна лічыць 9 дакументаў аб спаленні нямецкімі акупантамі

вёскі Баркі Кіраўскага раёна і забойстве яе жыхароў 15 чэрвеня 1942 г. Асноўныя звесткі вынікаюць з акта ваеннага следчага Мазнічэнкі, які быў складзены праз два гады пасля падзей на падставе звестак, атрыманых у працэсе апытання чатырох былых жыхароў вёскі, хто з'яўляўся сведкай падзей і застаўся жывым. Паводле іх расповядаў, вёска Баркі складалася з 7 пасёлкаў: Пралетарскі, Дзяржынскі, Чырвоны Араты, Закрынічча, Старыя Баркі, Доўгаполле, Хватаўка. У гэтых пасёлках месцілася блізу 300 двароў з насельніцтвам агульнай колькасцю 1738 чалавек. Паводле дакумента, у маі месяцы партызаны пачалі праводзіць аперацыі супраць немцаў шляхам падрыву аўтамашын на шашы Бабруйск–Магілёў. Заўважым, што паводле дакумента, складзенага следчым на аснове звестак сведак, у маі месяцы на шашы было падарвана 5 нямецкіх аўтамашын.

Звернем увагу чытача на гэты дакладны факт: у вытрымцы з «Дакладной камандавання 208-га партызанскага атрада Ваеннаму савета Заходняга фронту» ад 28 ліпеня 1942 г. паведамляецца аб гэтым жа факце, але ў іншай фармуліроўцы: «в конце месяца немецкими властями в ответ на уничтожение 33 автомашин с 42 летчиками, ехавшими по шоссейной дороге Могилев–Бобруск», было расстараляна і спалена ўсё насельніцтва разам з вёскай. Вышэй у зборніку прыведзены яшчэ адзін дакумент, але нямецкага паходжання, то бок «Данясенне асобай каманды СС О. Дзірлевангера вышэйшаму фюрэру СС і паліцыі «Расія–Цэнтр Э. фон Баху» ад 16 чэрвеня 1942 г. «,з якога вынікае, што пры злучэнні дарогі з вёскі Баркі з шашой Магілёў – Бабруйск партызанамі былі абстраляны 3 нямецкія грузавыя аўтамабілі. Публікацыя дакументаў рознага паходжання паказвае, што асобныя падзеі патрабуюць больш глыбокага і крытычнага вывучэння, што пакуль не ўваходзіць у задачу аўтара гэтых радкоў.

Галоўнай мэтай артыкула з'яўляецца паказ маштабаў нацысцкіх злачынстваў у дачыненні да грамадзянскага насельніцтва, а не вывучэнне эфектыўнасці баявой дзейнасці партызан на тэрыторыі Магілёўскай вобласці летам 1942 г. У нашым выпадку ў цэнтры разгляду знаходзяцца факты знішчэння жыхароў вёскі і яе самой цягам аднаго дня – 15 чэрвеня 1942 г. (складальнікі зборніка прыводзяць дату 16 чэрвеня 1942 г. – *С. Н.*). Паводле звестак непасрэдных сведак тых падзей, хто застаўся жывым, «за падбітыя машыны» немцы 15 чэрвеня на золку акружылі ўсё пасёлкі і в. Баркі. Так, у вёсцы Закрынічча немцы пачалі выганяць усіх жыхароў з дамоў на край пасёлка, потым заганялі ў кожны з дамоў па 8 чалавек, прымушалі класціся на падлогу ў адзін рад па 4 чалавека, а другі рад галовамі да галоў першага рада, пасля чаго з аўтаматаў расстрэльвалі ляжачых на падлозе людзей. Адной са сведак, 30 гадовай Сакадынец Н. Ф., якая ляжала паміж расстраляных, удалося застацца жывой, хоць і параненай. У астатніх шасці пасёлках расправа з мірнымі жыхарамі была праведзена іншым спосабам: карнікі заходзілі ў кожны дом і, нічога не кажучы, расстрэльвалі вяскоўцаў:

і старых, і малых. Крывавая расправа была скончана ў сярэдзіне дня, пасля чаго вёска была спаленая. Паводле дакумента, у гэты дзень былі расстраляны жанчыны, старыя і дзеці ў агульнай колькасці 1 700 чалавек.

Аналіз дакументаў другога раздзела дае магчымасць для раскрыцця маштабаў знішчэння грамадзянскага насельніцтва Магілёўскай вобласці ў гады германскай акупацыі. Так, з дакумента № 70 «Звесткі Магілёўскай абласной камісіі НДК аб колькасці насельніцтва, забітага і выгнанага на прымусовыя работы нямецкімі акупантамі ў раёнах вобласці» (1945 г.) вынікае, што ўсяго па раёнах вобласці камісія склала 555 актаў, якія сведчылі: пра расстрэл 71 756 чалавек, павешанне 17 мірных грамадзян, спаленне 1286 чалавек, 95 загінулі ў час паветранай бамбардзіроўкі. З табліцы вынікае, што 20 920 жыхароў былі адпраўлены на прымусовая работы ў Германію. Заўважым, што табліца не ўтрымлівае звестак пра нацыянальны склад забітых.

З гэтага і іншых дакументаў бачна, што знішчэнне грамадзянскага насельніцтва адбывалася сістэматычна цягам усяго часу германскай акупацыі Магілёўскай вобласці. Выкарыстоўваліся самыя розныя метады, сярод якіх звернем увагу на ўдушэнне людзей газамі ў спецыяльным аўтамабілі. Так, увосень 1941 г. у гарадской бальніцы, дзе на лячэнні заходзіліся псіхічнахворыя, была абсталявана «душагубка» шляхам прыстасавання ад аднаго з вокнаў газаправодных трубак ад аўтамабіля да пакою з герметычнымі дзвярымі і іншай неабходнай ізаляцыяй ад доступу ў яе паветра. Калі пакой быў абсталяваны, пачалося ўдушэнне псіхічнахворых. Гэта адбывалася шляхам падачы газу ад выхлапной трубы аўтамабіля ў памяшканне, у якой прымусова заганяліся па 70–80 чалавек душэўнахворых і ў герметычна зачынены пакой напампоўваліся газы ад працуючага матора аўтамабіля, які знаходзіўся пад вакном у двары бальніцы. Такім шляхам былі загублены каля 700 чалавек, яшчэ 500 душэўнахворых былі забіты ў выніку падрыву гранатамі і расстрэлаў. Усяго ў Магілёўскай міжабласной псіхбальніцы было загублена 1300 душэўнахворых.

Звернем увагу чытача таксама на дакумент, які сведчыць аб ліквідацыі германскімі захопнікамі слядоў злачынстваў на месцах правядзення масавых расстрэлаў мірных жыхароў і савецкіх ваеннапалонных. У распараджэнні складальнікаў апынулася заява жыхара вёскі Прысна Магілёўскага раёна С. І. Пілунова, які быў непасрэдным сведкам знішчэння гітлераўцамі вязняў з магілёўскай турмы і спальвання цел забітых. Адразу заўважым, гэты сведка пакінуў для гісторыі фактычна адзіны малавядомы дакумент, дзякуючы якому можна дэталёва рэканструяваць падзеі, звязаныя з ліквідацыяй слядоў нацысцкіх злачынстваў на акупаванай тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з 1943 г., калі ва ўсходніх раёнах пачала дзейнасць спецыяльная каманда пад сакрэтным кодам 1005 ці «зондэркаманда-1005».

Менавіта ёй ставілася задача па знішчэнні слядоў на месцах расстрэлаў шляхам эксгумацыі і спальвання забітых людзей. Сведку гэтых падзей удалося выжыць пасля таго, як ён удзельнічаў у рабоце па ўскрыцці месцаў масавых пахаванняў з савецкімі ваеннаслужачымі, грамадзянскімі асобамі, у тым ліку дзецьмі, старымі, падлеткамі і жанчынамі.

Знаёмства толькі з некалькімі архіўным дакументамі і матэрыяламі паказвае, наколькі маладаследаванай з'яўляецца гэта тэма для цяперашняга пакалення моладзі і студэнтаў, а таксама ваенных гісторыкаў, калі даследаванне гісторыі нацысцкіх злачынстваў весці выключана да базе крыніц і новых дакументаў. Дзякуючы іх выданню на парадак дня беларускіх гісторыкаў павінна быць пастаўлена пытанне аб параўнаўчым аналізе тых падзей шляхам выкарыстання дадатковых дакументаў і матэрыялаў нямецкага паходжання, а таксама даследавання наступстваў нацысцкага генацыду на акупаванай тэрыторыі не толькі Магілёўскай, але і іншых абласцей Беларускай ССР у 1941–1944 гг.